# ЛІНОЎСКІ ГАСЦІНЕЦ

## Якасць жыцця вясковага жыхара залежыць таксама ад стану дарогі — перакананы ў сельвыканкаме

**Нездарма свята вёскі Лінова з нагоды яго 555-годдзя назвалі «Ліноўскі гасцінец». Мелі на ўвазе, вядома, і пачастунак, але ў першую чаргу дарогу, якая вядзе на свята. Побач з Ліновам — чыгуначная станцыя Аранчыцы, на якую прыбывалі многія з гасцей, а далей прасціраецца гасцінец, што вядзе ў цэнтр Лінова. Вось такі сімвалізм узялі за аснову пры распрацоўцы эмблемы свята і яго назвы.**

Пра гэта карэспандэнту «МС» расказала **старшыня сельскага Савета Таццяна МАРДАНЬ**. «Фестываль правілі летась у жніўні, — працягвае Таццяна Мікалаеўна. — А назву рашылі захаваць. І ўсе наступныя святы вёскі таксама будзем называць «Ліноўскі гасцінец». А што датычыцца дарог, то нам сёння не сорамна перад нашымі жыхарамі. Работа па паляпшэнні дарог вядзецца пастаянна. І за апошні год зроблена нямала».

З кіраўніком мясцовай улады едзем па вуліцах аграгарадка, дзе праведзены работы па абнаўленні дарожнага пакрыцця. У гэтым спісе вуліцы Дачная, Маладзёжная, Сонечная, дзе асфальт пракладзены цалкам. На вуліцах Вакзальнай, Паркавай і Шырокай абноўлены ўчасткі дарогі. Першымі рабілі Шырокую і Паркавую. Таццяна Мікалаеўна расказала пра цікавы выпадак на вуліцы Шырокай. Калі ўжо праклалі асфальт, з'ехала тэхніка, а кіраўнік мясцовай улады адной чы прыпынілася, выйшла з машыны, каб палюбавацца вынікамі работы, насустрач ёй з дому выйшла жанчына. Як высветлілася, Вера Мікалаеўна Рэчыц 1940 года нараджэння добра памятае мінулае сваёй вёскі, нават апошнія гады вайны. Яна расказала многа цікавага, у тым ліку згадала, як гаравалі ад бездарожжа ў яе дзяцінстве. Мясцовасць нізінная, вясной і восенню людзі літаральна плавалі, дошкі падсцілалі, каб выйсці з двара. Паводле слоў сталай жанчыны, бывала, у школу не ішлі, бо не было як, калі поўныя боты вады набярэш, не выседзіш на занятках. Апошнія паўстагоддзя, вядома, дарогу даглядалі, яна была грунтовай, яе перыядычна падсыпалі, толькі летам цярпелі ад пылу. А вось цяпер дарога стала як сапраўдны гасцінец, толькі з гарадскім размахам, пракаментавала бабулька і дадала: «Вось бы мама мая ўстала і паглядзела, як прыгожа стала каля яе хаты». Сапраўды, вуліца Шырокая стала прывабнай у тым ліку і для навасёлаў.

Не так даўно маладая шматдзетная сям'я купіла дом, які пустуе. Дом непрыгодны для жылля, ён пойдзе пад знос, але новыя гаспадары набылі яго з-за ўчастка. У іх была магчымасць узяць участак у завулку Вакзальным, дзе цяпер будуюцца навасёлы, але яны аддалі перавагу гэтай мясціне. Найперш таму, што цэнтральная частка вёскі, побач школа і садок, Дом культуры, ну і новая дарога адыграла не апошнюю ролю.

Вуліца Сонечная пад веснавым сонцам выглядае ўрачыста, бо шырокая, з новым асфальтам. З абодвух бакоў вуліцы — дыхтоўныя дамы. Такія ж і іншыя вуліцы з абноўленым пакрыццём. Забудоўваецца завулак Вакзальны, там ужо падведзены інжынерныя камунікацыі. Калі жыллё будзе здадзена ў эксплуатацыю, чарга дойдзе і да дарогі. Цяпер вядзецца ўкладка асфальту на дарозе Аранчыцы-Варотнае.

Літаральна нядаўна зроблена падсыпка ўчастка дарогі «Арабі — Кутнявічы». Там штодня праходзіць школьны аўтобус. Дарога была зусім дрэннай — гэта мякка сказана. Асабліва пасля дажджу ў міжсезонне праехаць часам было няпроста. Жыхары абедзвюх вёсак гадамі наракалі на гэтую дарогу. Аб сваёй праблеме гаварылі выбаршчыкі і на сустрэчы з кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Юрыем Наркевічам. Юрый Іосіфавіч палічыў гэта наказам выбаршчыкаў і таксама паспрыяў рамонту дарогі. Асфальт там не паклалі, але дарогу выраўнялі, адрамантавалі, падсыпалі гравіем. І цяпер праблемных раней два з паловай кіламетры сталі цалкам прыдатныя для руху на любым транспарце, у чым мы са старшынёй сельвыканкама і



Працуе ДРБУ-140.

пераканаліся, праехаўшы на легкавой машыне.

— На нашы дарогі грэх наракаць. У Лінове яны добрыя, — заўважыў **дэпутат Пружанскага раённага Савета, дырэктар мясцовага сельгаспрадпрыемства Васіль КАЗЬМЯРЧУК**. — Варта сказаць словы падзякі спецыялістам ДРБУ-140, якія правялі вялікую работу за мінулы год па асфальтаванні і паляпшэнні нашых вуліц дый і працягваюць падтрымліваць іх у належным стане. Як ні круці, дарогі — першая прыкмета якасці жыцця. Каб яны былі дрэнныя, людзі наўрад ці так актыўна будаваліся б у нашым аграгарадку, і цана на жыллё не трымалася б стабільна высокай. А калі будуюць, набываюць, значыць, жыць у нас камфортна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**

*Пружанскі раён.*

ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

# ПРЫРОДА АБ'ЯДНАЛА ТУРАЎЧАН

Фота Жыткавіцкай раённай газеты «Новае Палессе».



**На Гомельшчыне адным з пераможцаў адкрытага конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў стаў праект актывістаў з Жыткавіцкага раёна. Іх ідэя — правесці ў іх родным Тураве азеляненне і добраўпарадкаванне рэкрэацыйных зон урочышча П'явачнік. Справа ўжо зрушылася з месца. Жыхары аднаго з самых старажытных гарадоў Беларусі вельмі актыўна падтрымалі гэту грамадзянскую ініцыятыву.**

З гонарам за землякоў расказвае аб тым, як у горадзе прыступілі да рэалізацыі праекта, **старшыня Тураўскага гарадскога Савета дэпутатаў Ігар МІЦОРЫЧ**. Па словах Ігара Леанідавіча, ва ўрочышчы, што на ўскраіне горада каля навенькіх шматпавярховікаў, некалі было невялікае возера, аблюбаванае рыбакамі і мясцовай дзятвой. З часам возера змялела, зарасло вербалозам, практычна здзічэла.

— Даўно марылі добраўпарадкаваць гэты прыродны куток, каб было чыста і ўтульна, — падкрэслівае старшыня Тураўскага гарсавета.

Летась непадалёку ад урочышча быў узведзены шматпавярховы дом для работнікаў Тураўскага малочнага камбіната. Тарэц навенькага пяціпавярховіка ўпрыгожвае мурал з выявай Кірылы Тураўскага.

— Стала відавочна, тэрыторыя ўрочышча, што побач з домам, павінна таксама адпавядаць і быць добраўпарадкаванай, — тлумачыць Ігар Міцорыч. — Яшчэ з мінулай восені звярнуліся па дапамогу да прадпрыемстваў і арганізацый горада, каб пачаць добраўпарадкаванне тэрыторыі. Жыхары дамоў, што побач з урочышчам, таксама вельмі актыўна адгукнуліся, прапанавалі сваю дапамогу ў ачыстцы тэрыторыі ад вербалозу. Узнікла ідэя ўдыхнуць жыццё ў стары П'явачнік і зрабіць каля возера гарадскую зону сямейнага адпачынку. Вырашылі прапанаваць праект азелянення і добраўпарадкавання рэкрэацыйных зон урочышча П'явачнік для ўдзелу у конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў. Мы былі вельмі рады, калі даведаліся, што наш праект стаў адным з пераможцаў конкурсу.

Згодна з праектам, у выніку комплекснага добраўпарадкавання ўрочышча тут з'явіцца камфортная рэкрэацыйная зона з эколагаасветніцкім патэнцыялам. Будзе добраўпарадкавана больш чым два з паловай гектара тэрыторыі.

Фінансаванне грамадзянскай ініцыятывы прадугледжана на парытэтных пачатках. На рэканструкцыю ўрочышча П'явачнік неабходна 30 тысяч рублёў, 27 з якіх вылучана з абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў, і тры тысячы (згодна з умовамі не менш за 10 %) сабралі жыхары горада.

Дарэчы, праект актыўна падтрымалі працоўныя калектывы, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, проста неабыякавыя жыхары Турава. Акрамя грашовай дапамогі, людзі прапанавалі паўдзельнічаць у ініцыятыве і фізічна. Цяпер, як толькі дазволіла надвор'е, на тэрыторыі правялі суботнік. Прыйшло папрацаваць сюды каля сарака чалавек: работнікі ўстаноў адукацыі і культуры, прадпрыемстваў і арганізацый горада, працаўнікі камунальнай службы. На прыбярэжнай палясе прыбіралі смецце, леташнюю траву і лісце, выразалі хмызняк.

— Мы не толькі выступаем з ініцыятывай, але і самі прыкладаем намаганні для развіцця нашага горада. Падтрымліваць яго ў чысціні і парадку, па-мойму, абавязак кожнага, хто тут жыве, — падзяліўся **настаўнік сярэдняй школы № 1 Турава Уладзіслаў РАБІКАЎ**.

— Прыемна мець пад акном прыгожую зялёную зону. На суботнік з радасцю выйшлі ў свой выхадны, — расказалі **супрацоўнікі Тураўскага малочнага камбіната Сяргей і Вольга СТАМПКОЎСКІЯ**, якія ў мінулым годзе атрымалі кватэру ў новым доме якраз каля П'явачніка.

Папрацаваць на суботніку на ўрочышчы выйшаў і **настаўнік сярэдняй школы № 2 Турава Аляксей МАРОЗ**. Аляксей Уладзіміравіч перакананы, што так дарослыя асабістым укладам паказваюць дзецям прыклад актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

— Нашы дзеці ўжо цікавіліся, калі і ім можна будзе паўдзельнічаць у праекце, — расказаў настаўнік .

Пакуль актыўныя работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі ўрочышча стрымлівае высокі ўзровень грунтовых вод. Як толькі будзе магчыма, на аб'екце пачнецца паглыбленне дна вадаёма, будзе працаваць землярыйная тэхніка. На ўрочышчы давядзецца яшчэ выкарчаваць пустазелле — драўняна-хмызняковую расліннасць, умацаваць берагавую лінію.

— Далей па плане — добраўпарадкаванне пешаходных і веласіпедных дарожак, зон адпачынку, спартыўнага і дзіцячага гульнявога гарадкоў, стварэнне малых архітэктурных форм, клумбаў. Прадугледжаны сістэма дэкаратыўнага і функцыянальнага асвятлення, паркоўка, — дадаў старшыня Тураўскага гарасавета Ігар Міцорыч. — Лічу, што конкурс грамадзянскіх ініцыятыў — магчымасць для жыхароў населеных пунктаў у партнёрстве з дзяржавай увасобіць у жыццё сацыяльна значныя праекты на карысць сваёй малой радзімы.

Дарэчы, як заўважыў Ігар Леанідавіч, тураўская прырода, здаецца, таксама адгукаецца на актыўнасць людзей на тэрыторыі ўрочышча. Ужо цяпер пасля добраўпарадкавання на вадаём прыляцелі вадаплаўныя птушкі. Тураў — вядомы пункт прыцягнення ўдзельнікаў акцыі па назіранні за птушкамі і папулярызацыі аднаго з самых займальных навуковых хобі — бёрдвотчынгу. Падчас сезонных міграцый у наваколлі старажытнага горада на адпачынак спыняюцца мільёны пералётных птушак, мноства з іх гняздуюцца тут. Таму добраўпарадкаваны стары П'явачнік, магчыма, стане новай любімай лакацыяй для бёрдвотчараў з розных куткоў краіны.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНІКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 11.766. Нумар падпісаны ў 19.30 9 красавіка 2024 года.